# ЯК БУДЗЕМ РАЗВІВАЦЬ ІНТЭЛЕКТ ДЗЯРЖАВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу ўдзельнікаў з'езда на шэрагу кірункаў удасканалення і далейшага развіцця айчыннай навукі.

### ...Па вытворчасці

— Трэба сумесна вырашыць асноўныя праблемы машынабудавання, прамысловасці ў цэлым. Бо менавіта ў прамысловасці — ядро ўсіх інавацый. Няма краін з моцнай навукай і слабай прамысловасцю — і наадварот, — заявіў Прэзідэнт.

Прамысловасць разам з навукай павінны вызначыць кірункі дыверсіфікацыі і мадэрнізацыі вытворчасцяў, забяспечыць сістэматычную работу па ацэнцы надзейнасці і якасці прадукцыі, павысіць высокатэхналагічнасць вытворчасці. Асобнае даручэнне Аляксандра Лукашэнкі датычылася распрацоўкі праграмы развіцця электратранспарту. Сярод іншага яна павінна ўключаць стварэнне і выпуск айчынных элементаў электрапрывада і акумулятараў.

### ...Па сельскай гаспадарцы

— Вучоным неабходна распрацаваць, а Мінсельгасхарчу — рэалізаваць комплекс мер па павышэнні ўзроўню рэнтабельнасці сельгаспрадпрыемстваў, — даручыў кіраўнік краіны. Ён звярнуў увагу, што ў нашай аграрнай сферы захоўваецца шэраг унутраных праблем эканамічнага, сацыяльнага характару, вырашаць якія неабходна з апорай на навуку.



Фота БЕЛТА.

### ...Па ІТ-тэхналогіях

Літаральна днямі кіраўнік дзяржавы правадзіў нараду па праекце дэкрэта «Аб развіцці лічбавай эканомікі ў краіне». Тады ж Прэзідэнт адзначыў: лічбавая трансфармацыя эканомікі з'яўляецца адным з ключавых прыярытэтаў.

— Паглядзіце, што зараз адбываецца, — акцэнтаваў увагу навукоўцаў Аляксандр Лукашэнка. — Робатызацыя ахоплівае прамысловасць і сяло. ІТ-платформы выціскаюць традыцыйны гандаль, блокчэйн — фінансы. Штучны інтэлект усё часцей замяняе чалавека ў прывычных сферах жыцця. І ў нас інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі трэба накіроўваць на стварэнне інтэлектуальных сістэм апрацоўкі звышвялікіх аб'ёмаў даных, падтрымкі прыняцця рашэнняў для органаў дзяржаўнага кіравання, «воблачных» і іншыхтэхналогій.

### ...Па стварэнні навукова-тэхнічных паркаў

У прыватнасці, у сферах бія- і нанатэхналогій, фармацыі і прыладабудавання.

— Вы прапануеце, каб платформай для паскарэння работ па даследаваннях і стварэнні айчыннай фармацэўтычнай, бія- і нанатэхналагічнай прадукцыі стаў Нацыянальны навукова-тэхналагічны парк «БелБіяград». Я шмат над гэтым думаў. Трэба разумець, што калі паглядзець на сутнасць вашых прапаноў, то вы хочаце нейкія прадпрыемствы, групы навукоўцаў, нейкія кірункі зняць з навукі і змясціць у нейкі «град». Не ведаю, калі без гэтага не могуць развівацца кірункі ў галіне бія- і нанатэхналогій, прыладабудавання, — ну давайце іх змесцім у нейкі «град» накшталт Беларуска-кітайскага парка «Вялікі камень», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Але, адзначыў Прэзідэнт, калі мы можам працаваць зыходзячы з таго, як зараз развіваюцца ў нас гэтыя кірункі, даваць рэзультат — то навошта ламаць сістэму? І траціць на гэта вялікія грошы — а лішніх у нас, як вядома, няма.

### ...Па гуманітарных навуках

У іх свая функцыя, не менш важная. На думку Аляксандра Лукашэнкі, «найважнейшым прадуктам гуманітарных ведаў з'яўляюцца сацыяльныя тэхналогіі»:



— Сёння ствараюцца рэцэпты кіравання свядомасцю людзей. Гэтыя тэхналогіі дзейнічаюць і за межамі краіны — праз СМІ, інтэрнэт і не заўсёды на карысць Беларусі. Трэба навучыцца супрацьдзейнічаць негатыўным тэндэнцыям у гэтай сферы. Трэба распрацоўваць уласныя сацыяльныя тэхналогіі, выкарыстоўваючы іх для кансалідацыі грамадства, выхавання патрыятызму, стымулявання творчай ініцыятывы людзей на ўсіх узроўнях.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сёння і ў сродках масавай інфармацыі, і ў інтэрнэце шмат меркаванняў розных «псеўдааналітыкаў, якія імкнуцца разбурыць стабільнасць і спакой у нашым грамадстве — і не толькі ў нашым». Трэба, упэўнены кіраўнік краіны, каб у адказ гучаў голас аўтарытэтных навукоўцаў-дзяржаўнікаў.

### ...Па фінансаванні навукі

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на эфектыўнасць выкарыстання навукай капіталаўкладанняў у яе. Павінна быць аддача:

— Ад усіх арганізацый і галін мы патрабуем галоўнага — рэзультату. Я паўтару: не будзе рэзультату — не будзе грошай. Навука ад выканання гэтага патрабавання не павінна заставацца ўбаку.

Ёсць і іншы бок медаля — не выкарыстоўваюцца ўсе сродкі з інавацыйных фондаў — і гэта таксама недапушчальна.

— У нас велізарныя грошы пры ўсіх скаргах вучоных штогод не асвойваюцца! За 11 месяцаў гэтага года рэспубліканскі і мясцовыя інавацыйныя фонды выкананы: рэспубліканскі — на 41%, мясцовы — на 24% ад гадавога плана. Якіх вам яшчэ грошай не хапае? Яны ж ляжаць, вазьміце іх! — заклікаў Прэзідэнт. У гэтай сувязі ён нагадаў пра 15-мільярдны льготны крэдыт для Беларусі ад КНР, які таксама асвойваецца даволі марудна.

### ...Па навуковых кадрах

Прэзідэнт параіў закладваць інтарэс да навукі яшчэ ў школе. Важна, каб не перарывалася сувязь паміж школай і ўніверсітэтамі, а то часта ва ўстановах вышэйшай адукацыі не ведаюць, колькі адораных выпускнікоў школ сталі іх студэнтамі. Для таго каб не было кадравага голаду ў навуцы, створана многае: напрыклад, ёсць фонды таленавітай і адоранай моладзі.

— Мы можам па праве ганарыцца дасягненнямі нашых школьнікаў, студэнтаў на міжнародных алімпіядах. Найбольш адораныя атрымліваюць падтрымку спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі. Надышоў час вывесці работу з такой моладдзю на якасна новы ўзровень: аб'яднаць рэсурсы найбольш таленавітых вучоных і педагогаў у рабоце з падрастаючым пакаленнем на высокатэхналагічных навуковых пляцоўках, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Звярнуўся кіраўнік краіны і да тэмы прэстыжу навукі, прафесіі вучонага — зараз гэты прэстыж паступова вяртаецца, і дзяржава, у сваю чаргу, прыкладае шэраг намаганняў. Гэта і павышэнне заработнай платы ў сферы, і вырашэнне жыллёвай праблемы маладых навукоўцаў... Усё для таго, каб краіна развівалася і была сапраўды інтэлектуальнай. Прынамсі, менавіта так — «Беларусь інтэлектуальная» — вызначана будучая мадэль нашай краіны ў праекце стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040», які разгледзеў і ўхваліў з'езд вучоных.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Абмеркаванне

# ПЛАН НА 20 ГАДОЎ

**На II З'ездзе вучоных ухвалілі стратэгію «Навука і тэхналогіі: 2018—2040». У Палацы Рэспублікі сабраліся больш за 2500 прадстаўнікоў навукі (і айчыннай, і замежнай), каб падвесці вынікі года і скласці планы на будучыню. На выстаўцы ў фае паказалі сённяшнія дасягненні: ад сучасных касмічных тэхналогій да археалагічных знаходак IV—III тысячагоддзяў да нашай эры. Падчас мерапрыемства быў заслуханы шэраг дакладаў. Наш карэспандэнт занатаваў асноўныя моманты.**

**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,** звярнуў увагу, што толькі сёлета было распрацавана каля 40 нарматыўна-прававых актаў, накіраваных на ўдасканаленне навуковай, навукова-технічнай і інавацыйнай дзейнасці. Цяпер стаіць задача павысіць навукаёмістасць ВУП да 1% да 2020-га і далей паэтапна да 3% — гэта сусветны ўзровень.

Сярод дасягненняў бягучага года Уладзімір Гусакоў адзначыў распрацоўку партатыўнага суперкамп'ютара, мацнейшага за СКІФ у 2,5 раза, і станцыю ў Антарктыдзе, якая будзе дзейнічаць круглы год. Ён адзначыў, што «зараз мы імкнёмся дабівацца поўнага асваення распрацовак, атрыманых па ўсіх праграмах навуковых даследаванняў». Да таго ж пастаўлена задача, каб пры кожным інстытуце была свая навукаёмістая вытворчасць або гаспадарчаразліковае камерцыйнае падраздзяленне. За два апошнія гады стварылі 18 такіх аб'ектаў.

Старшыня Прэзідыума НАН таксама растлумачыў, што стратэгія да 2040-га будзе рэалізавана ў тры этапы. Першы — да 2020-га — будзе прысвечаны актуалізацыі зачынаў, якія ёсць, з улікам сусветных дасягненняў. Другі — да 2030-га — завяршэнню лічбавай мадэрнізацыі традыцыйных галін эканомікі і фарміраванню комплексу ключавых канкурэнтных пераваг. Трэці — да 2040-га — нарошчванню кампетэнцый мэтавых сегментаў інтэлектуальнай эканомікі і выхаду на лідзіруючыя пазіцыі па асобных навукова-тэхнічных напрамках.

Далейшае развіццё навукі немагчыма без моцнай падрыхтоўкі кадраў. Зараз ідзе распрацоўка стандартаў адукацыі пакалення «3+», якія ўключаюць у тым ліку развіццё прадпрымальніцкіх здольнасцяў. **Рэктар БДЭУ Уладзімір ШЫМАЎ** звярнуў увагу на пэўныя праблемы навукова-адукацыйнага комплексу. Аляксандр Лукашэнка па выніках даклада прапанаваў распрацаваць у наступным годзе ў рамках ВНУ сістэму матывацыі вучоных.

Пра супрацоўніцтва беларускай і расійскай навукі гаварыў **Аляксандр СЯРГЕЕЎ, прэзідэнт Расійскай акадэміі навук.** Ён прапанаваў ажыццяўляць новыя праекты па сельскай гаспадарцы, напрыклад па дакладным земляробстве, разумнай сельскай гаспадарцы, робатызацыі гэтай галіны, па глыбокай перапрацоўцы, якая мае вялікі экспартны патэнцыял. Таксама перспектыўна выглядае кааперацыя ў медыцыне, напрыклад у прамянёвай тэрапіі. Але беларуская і расійская акадэміі навук адрозніваюцца па структуры і ў падыходах да свайго развіцця. Кіраўнік нашай дзяржавы адзначыў, што будзе ў найбліжэйшы час сустракацца з прэзідэнтам Расіі і ўзніме пытанне аб павышэнні статусу Расійскай акадэміі навук. Навукоўцы працуюць у адным напрамку, і інтэграцыя ў гэтым плане дапаможа хутчэй рухацца наперад.

Пра развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў навуцы выказаўся і **старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ.** Дарэчы, у наступным годзе пройдзе II Форум вучоных СНД у Ерэване. На ім плануецца вызначыцца з практычнымі сродкамі ўзмацнення інтэграцыйнага працэсу ў навуковай сферы. Разам з тым праблемным пытаннем застаецца стварэнне міждзяржаўнага фонду навуковых даследаванняў. З аднаго боку, ёсць зацікаўленасць вучоных, з другога — фінансавы складнік патрабуе абгрунтавання і ўзгаднення на экспертным узроўні, што зараз і адбываецца. Сёння ў рамках СНД рэалізуецца дзесяць пілотных інавацыйных праектаў, у дзевяці з якіх задзейнічаны беларускія вучоныя.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ У ліку найлепшых

# Ушануюць маладых аграрыяў

**Сёння найлепшым маладзёжным экіпажам і маладым кіроўцам Міншчыны па выніках уборачнай кампаніі — 2017 уручаць грашовыя прэміі.**

Урачыстая цырымонія ўшанавання пераможцаў маладзёжнага конкурсу «Моладзь Міншчыны — за ўраджай», у якім сёлета спаборнічалі 247 маладзёжных экіпажаў і 195 маладых кіроўцаў вобласці, пройдзе ў боўлінг-цэнтры Madison.

Мінская вобласць з'яўляецца лідарам сярод аграрыяў краіны. Сваю лепту ў агульны каравай унеслі і маладзёжныя экіпажы, якія намалацілі 188 047,685 тоны збожжа (маладыя кіроўцы — перавезлі 183 682,5 тоны).

У мерапрыемстве прымуць удзел больш за паўсотні маладых перадавікоў уборачнай. Акрамя ўрачыстай цырымоніі, для іх традыцыйна будзе арганізаваны абласны турнір па боўлінгу: 22 каманды лідараў уборачнай Міншчыны будуць змагацца за тытул самай «прасунутай» каманды не толькі ў прафесіі, але і ў спорце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Камунальныя стасункі

# У ЖЭСы набяруць псіхолагаў?

**Падзел функцый заказчыка і падрадчыка, стварэнне адзінага цэнтра для зваротаў грамадзян «115» дазволілі больш аператыўна рэагаваць на заўвагі спажыўца і павысіць якасць паслуг за кошт незалежнага кантролю і павышэння канкурэнтнасці асяроддзя.**

**Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і сродкамі масавай інфармацыі Мінжылкамгаса Генадзь АКСЦІЛОВІЧ** адзначыў, што станоўчыя вынікі сталі найлепшым доказам правільнасці абранай стратэгіі і эфектыўнасці структурных пераўтварэнняў. Тым не менш для павышэння якасці работы з насельніцтвам застаецца яшчэ нямала рэзерваў. Працу на прадпрыемствах трэба арганізаваць такім чынам, каб ні адзін зварот не застаўся без увагі. Для гэтага мэтазгодна разгледзець магчымасць стварэння ў кожнай службе ЖКГ сталіцы аддзелаў па рабоце з кліентамі. Для такіх падраздзяленняў трэба падабраць спецыялістаў адпаведнай кваліфікацыі, якія не толькі разбіраюцца ў вытворчых пытаннях, але і валодаюць пэўнымі ведамі ў сферы псіхалогіі.

«Спажывец павінен бачыць у службе заказчыка непасрэднага абаронцу сваіх інтарэсаў і даваць ёй,— лічыць Генадзь Аксціловіч. — Толькі так можна наладзіць бездакорную зваротную сувязь, якая дапаможа своечасова выяўляць існуючыя праблемы і прымаць меры па іх ліквідацыі. Вопыт Мінска паказаў, што вынік работы залежыць не толькі ад укаранення сучасных тэхналогій, але і ад умення размаўляць з людзьмі, ад здольнасці пачуць спажыўца і знайсці з ім паразуменне».

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*